**ФАРМІРАВАННЕ АРФАГРАФІЧНЫХ НАВЫКАЎ НА** ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Н.У. Раманеня (УА МДПУ імя І.П. Шамякіна)*
Навуковы кіраўнік – В.Я. Барысенка, канд. філал. наук, дацэнт

Фарміраванне ў школьнікаў трывалых арфаграфічных навыкаў – адна з найважнейшых задач вывучэння беларускай мовы ў школе, так як беспамылковае пісьмо забяспечвае дакладнасць выказвання думак, узаемаразуменне людзей у пісьмовых зносінах. Ад таго, наколькі поўна будуць сфарміраваны навыкі правапісу ў пачатковых класах, залежыць далейшае навучанне дзяцей ў школе, іх арфаграфічная пільнасць, іх здольнасць засвойваць родную мову ў пісьмовай форме.

Вядучыя метадысты лічаць галоўным пры навучанні правапісу навучыць дзяцей карыстацца арфаграфічным правілам пры рашэнні разнастайных арфаграфічных задач. Аднак іх рашэнне магчыма толькі пры ўмове, што вучань бачыць аб'ект прымянення правіла – арфаграму. Толькі здолеўшы знайсці арфаграму, вучань зможа вырашыць пытанне аб яе канкрэтным напісанні. Такім чынам, уменне выяўляць арфаграмы, з'яўляецца базавым арфаграфічным уменнем, першым этапам пры навучанні правапісу, залогам пісьмовай мовы. Няўменне вылучаць арфаграмы пры пісьме – адна з галоўных прычын, якая "тармозіць" развіццё арфаграфічнага навыку. Не "рэагуючы" на арфаграмы, школьнікі пішуць з памылкамі і пры гэтым упэўнены, што пішуць дакладна; правілы ў гэтым выпадку аказваюцца непатрэбнымі, вучні пра іх часта і не ўспамінаюць.

Арфаграфічная пільнасць развіваецца паступова, у працэсе выканання разнастайных практыкаванняў, якія забяспечваюць зрокавае, слыхавое, артыкуляцыйнае, маторнае ўспрыманне і запамінанне арфаграфічнага матэрыялу, што з'яўляецца неабходнай умовай фарміравання арфаграфічнай пільнасці.

Настаўніку складана навучыць дзяцей арфаграфічнай пільнасці і павысіць матывацыю да заняткаў беларускай мовы.

Многія філолагі і выкладчыкі займаліся выяўленнем прычын гэтай з'явы. Сучасная методыка выкладання імкнецца выкараніць іх, навучыць дзяцей пісаць арфаграфічна правільна, любіць і паважаць беларускую мову. Для гэтага распрацоўваюцца новыя падручнікі і навучальныя дапаможнікі, выяўляюцца самыя прадуктыўныя метады, у сучасную методыку ўносяцца змены, карэктуюцца недахопы. Настаўнікі пачатковай школы ўносяць вялікі ўклад у выкараненне арфаграфічнай непісьменнасці падрастаючага пакалення.

Такім чынам, пры сумеснай і сістэмачычнай рабоце вучні пачатковых класаў будуць з цікавасцю ставіцца да вывучэння роднай мовы, пры пэўных умовах у іх пачне развівацца арфаграфічная пільнасць, якая замацуецца ва ўстойлівы навык правільнага і свядомага пісьма.

МГПУ им. И.П. Шамякина